# Пра мінуўшчыну – сучаснікам



Сябра Рады грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры» і рэдкалегіі «Краязнаўчай газеты» прафесар Анатоль Пятровіч Грыцкевіч выдаў у «Кнігазборы» сваю чарговую кнігу «Старонкі нашай мінуўшчыны», якая сведчыць аб нязменнасці яго гістарычнага крэда – дакладнасці, аб'ектыўнасці, праўдзівасці ў адлюстраванні айчыннай гісторыі.

Беларускі фонд культуры і я, яго старшыня, шчыра ўдзячныя Анатолю Пятровічу за тую важную справу, якую ён выконваў на грамадскіх пачатках па падрыхтоўцы зборнікаў «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», выдадзеных БФК у 2000 і 2003 гадах. Дзякуючы яго намаганням быў падняты агромністы пласт гісторыі краіны праз яе найвыбітнейшыя постаці. На жаль, БФК вымушаны быў спыніць тую праграму з-за недахопу грошай. І вось, для нас нечаканасць... Анатоль Пятровіч працягвае сваю працу над стварэннем гістарычных партрэтаў дзеячаў навукі, культуры, палітыкі нашага краю, альбо тых, хто народжаны нашай зямлёю, апынуўся воляю лёсу ў іншых краях і ўславіў іх сваёй руплівай працай. Вось толькі некаторыя з іх, якім прафесар А. Грыцкевіч аддаў перавагу ў сваёй працы па часе ад вялікага князя Вітаўта да Станіслава Булак-Булаховіча. Тут жыццё і гісторыя каранаваных асобаў, князёў ВКЛ – ад Стэфана Баторыя да Станіслава Аўгуста Панятоўскага; гістарычныя партрэты асобаў з магутных магнацкіх родаў; выбітныя постаці Піліпа Орліка, Тадэвуша Касцюшкі, Мікалая Улашчыка. Гістарычныя падзеі, бітвы, даты – тое, чым займаўся Анатоль Пятровіч большую частку свайго 80-гадовага жыцця і назапасіў, я ўпэўнены, матэрыялаў не на адну такую кнігу.

Таму, хто хоча азнаёміцца з сапраўднай, а не з фальсіфікаванай гісторыяй краіны, смела і праўдзіва пададзенымі фактамі, раю набыць і, упэўнены, з вялікай цікавасцю прачытаць «Старонкі нашай мінуўшчыны». І разам з тым, пагартаць старонкі жыцця і самога Анатоля Грыцкевіча.

Я ж асабіста хачу яшчэ раз падзякаваць яму за нашу сумесную працу, і, безумоўна, за яго каштоўны падарунак – кнігу, якую я вызначаю як працяг працы над праграмай «Славутыя імёны Бацькаўшчыны».

*Уладзімір ГІЛЕП,*
*старшыня ГА «Беларускі фонд культуры»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ